View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE

Воюш І.

# Жанчына ў непрытульным свеце
## (Жаночыя вобразы ў прозе Міхася Зарэцкага)

Грамадская атмасфера 20 – 30 гг., з усімі яе супярэчнасцямі, выклікала да жыцця з'яўленне аўтара-праўдашукальніка і героя – шукальніка ісціны. Выдатным прадстаўніком мастацтва слова дадзенага перыяду з'яўляецца Міхась Зарэцкі (Міхаіл Яўхімавіч Касянкоў). Творчасць пісьменніка стала для нашчадкаў узорам творчай мужнасці. Яго найгалоўнейшая заслуга, паводле М. Мішчанчука, заключаецца ў тым, што "ён да канца сваіх дзён шукаў іншай, гуманістычнай праўды..." [1, с. 56?]. Гэтыя пошукі ў небяспечныя 30-я гады не знайшлі прызнання ў вульгарызатарскай крытыцы Я. Бранштэйна, М. Клімковіча, Д. Коніка. І, нягледзячы на ўзнагароджанне за раман "Вязьмо" як адзін з лепшых твораў пра калектывізацыю (на Рэспубліканскім конкурсе, прысвечаным 15-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі), Міхась Зарэцкі ў 1936 г. быў беспадстаўна арыштаваны.

Знешняе падабенства тэматыкі прозы пісьменніка да твораў іншых прадстаўнікоў літаратуры 20 – 30 гг. часта абмяжоўваецца агульнай тэмай – пераўтварэнне жыцця ў горадзе і на вёсцы. Уласцівая ж перыяду тэндэнцыйнасць не кранае глыбінных пластоў творчасці пісьменніка. Выхаваны ў высокадухоўным асяроддзі, выпускнік духоўнага вучылішча і семінарыі назаўжды пакінуў у сваёй душы і ўвасобіў у кнігах спачуванне і хрысціянскую любоў да чалавека, незалежна ад яго паходжання і перакананняў.

Міхась Зарэцкі стварыў запамінальныя характары жанчын сучаснага яму грамадства. Звернемся да вобразаў "былых" і "новых" жанчын прозы Міхася Зарэцкага і зробім спробу асэнсаваць іх ролю ў выяўленні ідэйнай глыбіні пісьменнікавых твораў.

Неабходна адзначыць, што аналіз спадчыны аўтара ў храналагічным парадку вымагае некаторых адступленняў з той прычыны, што мастакоўская палітра жаночых персанажаў уяўляе сабой арганічную цэласнасць, у якой сярод шматстайных сюжэтаў, праблем і характараў вырысоўваецца агульны трагічны вобраз.

Творчае пранікненне ў глыбіні чалавечай душы стварыла феномен рамантычнага героя Зарэцкага. Гэта не толькі адзінокі бунтар-мужчына у віры сацыяльных змен – гэта жанчына на грэбені жыцця і на яго дне. Яе рамантычны вобраз па сутнасці трагічны. Сімвал адцвіўшай кветкі сярод разнатраўя азначае душу жанчыны, апаленую пякучым святлом рэвалюцыі.

***Вобразы "былых" жанчын у "малой" прозе Міхася Зарэцкага.*** Характар савецкай і несавецкай жанчыны, у якім агульначалавечага больш, чым класавага, інтэрпрэтуецца празаікам як вобраз **"пажоўклай кветкі"**, які прасочваецца ва ўсёй творчасці пісьменніка. Упершыню ён быў маніфеставаны ў апавяданнях 1922 г. "Мар'я" і "Ворагі", а потым развіты і паглыблены ў творах "На маладое" (1924), "Бель" (1924), "Дзіўная" (1925), "На чыгунцы" (1926), "Кветка пажоўклая" (1928), "Ой, ляцелі гусі..." (1929), аповесці "Голы звер" (1926), раманах "Сцежкі-дарожкі" (1927) і "Вязьмо" (1932).

Як пісьменнік рамантычнага кірунку, Міхась Зарэцкі аддае шмат увагі барацьбе пачуццяў, душэўным рухам адзінокага чалавека. Таму нездарма ў ягоных творах першаступеннае месца адводзіцца каханню і любові як паняццям усеабдымным,

канцэптуальным, каштоўнасным. Рэвалюцыя, як яе бачылі маладнякоўцы, з якімі пачынаў малады аўтар, – шторм, здаровае паветра, вецер, навальніца, якая адбываецца ў грамадскай свядомасці, – адбіваецца і ў сямейнай, інтымнай сферы. Пры гэтым выражэнне жанчыны і мужчыны ў каханні – крытэрый ацэнкі іх чалавечай вартасці, безадносна прыналежнасці іх або да пакалення "лішніх", "былых", або да "новых", камсамольска-партыйнага рангу.

Каханне "пажоўклай кветкі" або да яе фатальнае, небяспечнае. Яно паўсюдна, паказальна называецца аўтарам "хваравітай слабасцю", "назойлівым успамінам", "шалёнай страсцю", "ліпучымі путамі", "зеллем", "павучыннем атрутным", "дрыгвянай багнай". Сапраўдансць такіх скептычных адносін да высокіх пачуццяў выклікае сумненні, і, пры падрабязным прачытанні, становіцца зразумелым абсалютна адваротнае паказанаму стаўленне празаіка да гэтай праблемы.

Вуснамі героя, які перажывае цяжкія хвіліны сумненняў, выказваюцца іншыя меркаванні. Прыгадаем, напрыклад, як у апавяданні "Ворагі" Міхась Зарэцкі апісвае першае каханне Гуторскага да Ніны: "Ён любіў яе. Любіў па-дзіцячаму. Хацеў глядзець на яе без канца, маліцца ёй, цалаваць яе... ручкі... Былі летуценні, дзівосныя юнацкія летуценні. Ён будаваў з іх сабе асобны свет, сваё асобнае, патаемнае, чароўнае жыццё" [4, с. 119].

У другую іх сустрэчу паміж людзьмі ўжо пралягла класавая мяжа. Сумненні ахопліваюць Паўла: "Любоў мае сваё асабістае права. Любоў не разбірае: ці вораг, ці прыяцель... яна бачыць толькі жанчыну, толькі яе жаночае харатво. Хіба яму можа хто ці што забараніць гэта? Хіба на каханне можна, як і на ўсё, глядзець выключна з класавага пагляду?" [4, с. 139]. Толькі з падачы Матроса Гуторскі вяртаецца да жорсткіх рэалій жыцця, намагаецца апраўдацца перад сваімі пачуццямі, перад сумленнем. Павел ажыццявіў свой выбар яшчэ тады, калі згадзіўся выкарыстаць Ніну ў паляванні на яе каханага – "бандыта" Зарубу, калі арштоўваў яе бацьку. Пасля Гуторскі – псіхалагічна зламаны партыйным абавязкам чалавек, якога да смерці страшыць "гэткая доля, як у Ніны Купрыянавай, – доля <u>пажоўклых</u>, <u>адарваных</u> ад дрэва <u>лістоў</u>... (тут і далей падкрэслена намі. – *І. В.*)" [4, с. 152].

"Што ж датычыцца сваёй уласнай пазіцыі, – піша пра месца аўтарскай думкі ў творы М. Мушынскі, – дык яна пісьменнікам выяўлена вельмі пэўна, акрэслена, толькі ў своеасаблівай, уласцівай мастацтву форме – праз эмацыянальную ацэнку паводзін героя, праз трапную мастацкую дэталь, праз падтэкст" [4, с. 508]. У нашым выпадку – праз палемічныя фразы Гуторскага, нібыта вымаўленыя праз сон у цягніку: "Шкада яе, але нічога не парадзіш... Гэткі закон жыцця... бязлітасны закон... Усё старое вымятаецца, выкідаецца, як непатрэбнае смяццё. Расчышчаецца дарога новаму..." [4, с. 151]. Тут ужо за пафасам жорсткай рэвалюцыйнай справядлівасці бачацца небяспечныя парасткі пацяробаўшчыны – расчышчаць, церабіць дарогу ў "казачнае харство" праз ачышчэнне ад "гэтае <u>ніклае кветкі</u>, гэтага хваравітага адсклёпку старога ладу" [4, с. 136], ад "<u>пажоўклых лістоў</u> старога, гнілога, забуранага навальніцай дрэва" [4, с. 152] – ад таких, як Ніна.

Вобраз Ніны Купрыянавай не ўспрымаецца як непазбежная ахвяра новага ладу. Жанчына сапраўды адчувае ўласную непатрэбнасць разбуранаму грамадству, але спадзяецца знайсці сваё месца ў жыцці. Хоць фактычна Ніна патрэбна Гуторскаму і свайму будучаму дзіцяці, але яна небяспечная для такіх, як Матрос, сваёй жаночай "хваробай да новага жыцця" – шкадлівасцю, інтэлігентнасцю, вернасцю агульначалавечым сямейным каштоўнасцям. Трагізм становішча жанчыны ў тым, што яна ўсведамляе бязвыхаднасць уласнага становішча. Яна ўжо прыгаварыла сябе да пакарання за "няправільную", "злачынную" любоў да бацькі, да Зарубы. "У вас жыццё наперадзе – поўнае, цэлае, неўламанае, – зайздросціць яна Гуторскаму. – У вас ёсць чым і дзеля чаго жыць... для вас ёсць месца, пачэснае месца ў жыцці... А я... я ўжо нябожчыца... Жывая нябожчыца..." [4, с. 151]. Унутраныя перакананні Ніны не даюць ёй пераступіць пэўную мяжу сумлення, і яна робіць апошні крок – страціўшы бацьку, Зарубу, адмаўляе ў каханні Гуторскау і разам з гэтым губляе білет у новае жыццё.

Такім чынам, ужо ў адным з ранніх апавяданняў Міхась Зарэцкі засведчыў, што яго стаўленне да грамадскіх змен "любым коштам" – крытычнае. Пры гэтым пісьменнік свядома апелюе да вобраза каханай жанчыны, якая пакутуе праз сваю духоўную адзіноту ў перайначаным свеце.

У сутычцы з лёсам аўтар выяўляе характар галоўнай гераіні апавядання "Мар'я". Праз выпрабаванні ён вядзе жанчыну да сапраўднага кахання. Пакінутая сваім хлопцам Андрэем, маладая Мар'я бярэ шлюб са сквапным Ягорам. Па яго загаду забівае сваё дзіця ад Андрэя. І, нарэшце, у сталым узросце сустракае ваеннага пісара Ляксандру, з якім шукае блізкасці.

У лірычным адступленні пра восень жыцця Міхась Зарэцкі фактычна піша пра сваю гераіню: "Восень жыцця чалавека... Хіба мала хараства ў гэтым адцвітанні душы, у гэтым сумна-пакорным развітанні з уцехамі, забавамі маладосці? Хіба не прыгожы гэтыя астатнія абуджэнні паволі засынаючага сэрца, гэтыя астатнія гулліва-радасныя выбухі заміраючага жыцця, гэтыя астатнія <u>запозненыя асеннія кветкі</u> (падкрэслена намі. – *І. В.*)?" [4, с. 75]. "Запозненая асенняя кветка" – гэта апошняе каханне Мар'і, каханне-ачышчэнне змарнаванай пакутамі душы, споведзь любаму сэрцу пра непапраўныя памылкі жыцця.

Моманты перажывання віны, роўнай духоўнай смерці, духоўнаму самазабойству і самаадмаўленню, падрываюць жыццёвыя сілы гераіні, прымушаюць застыць усе іншыя пачуцці. І толькі каханне, па Зарэцкім, здольна растапіць заледзянелае ў горы сэрца, таму натуральна, што пісьменнік дае магчымасць Ляксандры прыняць адзіна правільнае рашэнне – "палюбіць (Мар'ю) усёй істотай... Растапіць у гарачых праменнях усю тугу яе, маркоту..." [4, с. 72].

Любоў мужа Ягора да Мар'і аблытана "забабонамі", хоць той "проста моліцца на яе" [с. 69 зар т1]. Па-свойму зразумеўшы хрысціянскую ісціну, што адказнасць за ўчынкі жонкі перад Богам і людзьмі нясе адзін толькі муж, ён прымае рашэнне пазбавіцца ад ганьбы – Мар'інага дзіцяці. З гэтай прычыны Ягор прымушае Мар'ю бесперастанку маліцца – "прасіць у Бога <u>яму</u> (падкрэслена намі. – *І. В.*) царства нябеснага..." [4, с. 74].

Мар’я адзін за адным прымае ўдары лёсу і выходзіць у выніку маральным пераможцам у барацьбе з духоўнай адзінотай, ганьбаю, мужавым фанатызмам, смуткам па дзіцяці, “забабонамі” старога патрыярхальнага грамадства. Жыццё як узнагароду дорыць ёй хвіліны шчаслівага адцвітання, яшчэ адно малое – яшчэ адну надзею.

Аб каханні і “адказнасці за таго, каго прыручыў” (А. дэ Сэнт-Экзюперы) апавяданне “На маладое”. Марылька замужам за нялюбым Ахрэмам, але знаходзіць адзіную ўцеху ў грэшным каханні з маладзенькім Васільком (ён потым з’язджае ў горад). Муж даведваецца пра гэта і бярэ ў знахаркі Гаўрыліхі прываротнае зелле для жонкі. Апоеная Гаўрылішынай атрутай, ужо цяжарная, Марылька памірае.

Вобраз Марылькі – прадстаўніцы “старога” – яшчэ адзін вобраз “пажоўклай кветкі”. “А Марылька... Бедная яна... Панікла без пары, як кветка (падкрэслена намі. – *І. В.*) ў дрэнным, атрутным паветры. Зацягнула небараку згубная прорва жыццёвай багны...” [4, с. 237] – спачувае ёй аўтар напрыканцы твора. Жыццёвая багна прадстаўлена тут, як і ў “Мар’і”, у асобе мужчыны, выхаванага “забабонамі”. Стары свет увасабляе Ахрэм, і разуменне кахання ў яго таксама старасвецкае.

Вобраз Васілька па ролі ў сюжэце нагадвае Андрэя з апавядання “Мар’я”, але аўтар падае ў фінале твора трапную дэталь, якая глыбей дае зразумець, чаму навучыўся ў горадзе Васілёк. Калі на ягоных вачах памірае Марылька, рэакцыя ў хлопца нечаканая – яму “плакаць не хочацца. Няма слёз. Слёзы ў таго, хто губляе ўсё, хто стаіць перад цёмнай пустыняй, не бачыць нічога наперадзе. Слёзы ў таго, хто разам з каханым прадметам губляе надзеі, губляе сэнс свайго жыцця. Васілёк не з такіх. Васілёк моцна стаіць у жыцці, не зварухне яго няшчасце” [4, с. 237]. Узнікае пытанне – што ж за такія новыя людзі народжаны рэвалюцыяй, што іх не кранае смерць блізкага чалавека? Здольнасць хутка пераступаць праз мінулае, а потым і сумленне стане пазней крытэрыяльнай рысай ацэнкі герояў Зарэцкім. Хоць вобраз Марылькі больш меладраматычны, чым сацыяльны, тым не менш у апавяданні завастраюцца праблемы, якія пазней стануць вядучымі ў прозе пісьменніка.

Філасофская навэла “На чыгунцы” таксама ўтрымлівае вобраз “пажоўклай кветкі”. У гэтым творы няма персанажаў правых і вінаватых – ёсць яскравая карцінка з агромністай па маштабе эпохі, дзе не знаходзіцца месца маленькаму чалавечаму лёсу і каханню, а па вялікаму рахунку – лёсу “лішніх” з іх праблемамі – напрыклад, сапсаваным здароўем. Бязногі інвалід першай сусветнай вайны Яўмен, едучы ў цягніку, выратоўвае ад брудных заляцанняў маладую дзяўчыну. Абодва яны, безабаронныя перад жорсткім часам у сваёй слабасці, знаходзяць адно ў адным падтрымку і цеплыню. Разам закаханыя імкнуцца на радзіму да Яўмена, але на прыпынку калека не паспявае ўскочыць у вагон і застаецца адзін на пероне.

Апазіцыя маладога і здаровага (дзяўчына, салдаты) старому і абязвечанаму (Яўмен) бачыцца ў эпізодзе, калі Яўмен “сарваў нейкую пажоўклую кветку (падкрэслена намі. – *І. В.*) і, жартуючы, кінуў у твар ёй (Надзеі)” [4, с. 298]. Выказаў моцнай і прыгожай Надзеі сваю крыўду на жыццё – і застаўся на пероне, калі яго апошні цягнік “не ішоў, не каціўся, а танцаваў, рады, што кінуў тут чалавека” [4, с. 304].

Праблема страчаных надзей, адзіноты чалавека перад усясільным светам, пераважна нядобрым і неапраўдана жорсткім, увесь час хвалюе Зарэцкага, калі ён звяртаецца да тэмы "лішніх" людзей.

***Трагедыя "новай" жанчыны ў апавяданнях Міхася Зарэцкага.*** Зразумела, што падзел персанажаў-жанчын на "новых" і "былых" вельмі ўмоўны, бо савецкая жанчына ў яе тыповым выглядзе не сустракаецца ў Зарэцкага. Жанчына-сучасніца пісьменніка па азначэнні была прадстаўніцай дарэвалюцыйнага грамадства, якую прымушала змяняцца новае жыццё. Душа жанчыны раздвойвалася паміж традыцыйнымі хрысціянскімі каштоўнасцямі і абвешчанымі рэвалюцыяй багамі – і ў яе партрэце Міхась Зарэцкі да сімвала "пажоўклай кветкі" далучыў эпітэт "дзіўная".

У апавяданні "Бель" немалады рабочы Даніла шукае дарогу ў абяцаную светлую будучыню, і на гэтым шляху сустракае "свядомую" работніцу завода Ганну Матузову. Закахаўшыся, захоплены новымі поглядамі на жыццё, Даніла дзеля каханай пакідае сям'ю. Потым аказваецца, што ахвяра была марнай, бо у Ганны ўжо іншае захапленне. Даведаўшыся пра гэта, Даніла бяздумна крочыць у цемнату зімовай ночы і замярзае сярод завеі.

Неабходна адзначыць, што Ганнін учынак нельга разглядаць безадносна той атмасферы, якая была ў першыя паслярэвалюцыйныя гады. М. Мушынскі адзначае, што тады "ў асяроддзі інтэлігенцыі распаўсюдзіліся рознага роду лявацкія, нігілістычныя, ультрарэвалюцыйныя тэорыі сям'і, шлюбу, свабоднага кахання, розныя погляды на выхаванне дзяцей і г. д." [4, с. 508]. Поўнае хрысціянскага разумення свету сэрца Данілы натыкаецца на вонкава лагічныя, а па сутнасці разбуральныя погляды Ганны і Змітровіча, што намінуюцца як "бель". Яна блытае спрадвечныя маральныя арыенціры, замятае правільны шлях: "Бель гэта... І ўсярэдзіне – тож бель, бо ружовае знікла. Нічога няма – адна бель... А мо гэта не дарога?" [4, с. 207]. Апошняе пытанне для сучасніка гучыць як рытарычнае. І. Чыгрын у раздзеле "Гісторыі беларускай савецкай літаратуры" (1981) па творчасці Міхася Зарэцкага трактуе вобраз снегавой белі як "сімвал абнаўлення прыроды, рэвалюцыйнага абнаўлення жыцця" [3, с. 324[?]]. На нашу думку, значэнне гэтага сімвала абнаўлення мае хутчэй адмоўнае, чым станоўчае значэне.

Калі Даніла толькі пачынае разумець законы развіцця новага ладу, то ў дасведчанай, адукаванай Ганны ўжо ёсць уяўленне пра дзеянне вялікага рэвалюцыйнага механізма, які "пачынае рабіць. Заўважыў каля сябе ржу якую – прэч! Бачыць, што якая часціна машыны сапсулася, замінае толькі – прэч яе..." [4, с. 179]. У гэтых словах адлюстравана нежаночая дэструктыўнасць, адмаўленнне галоўных жаночых якасцяў – міласэрнасці і шкадавання, на змену якім ідзе бездухоўнасць. Разуменне ўнутранага жыцця ў Ганны таксама нежаночае. Душа – гэта "посуд", абы ён быў, "а чаго наліць – стане..." [4, с. 188]. Зарэцкі не мог не ведаць, што, паводле хрысціянскага светабачання, чалавек – сасуд для ўсеабдымнай Божай любові, і калі ў сэрцы знікае Бог (любоў), то ў ім пасяляецца д'ябал. Думаецца, з мэтай падкрэсліць не-боскае паходжанне савецкай любові аўтар укладае ў вусны Ганны менавіта слова з шырокім значэннем "любоў" (а не "каханне") у наступным маналогу, звернутым да Данілы: "Люблю... Трэба прасцей на рэчы глядзець... Ну, можа, упадабалася табе трохі... як жанчына...

Хочаш мяне... Навошта выдумваць яшчэ нешта надзвычайнае, вялікае, страшное... Час ужо знаць, што такое любоў...” [4, с. 189]. Натуральнае для аўтара-гуманіста адзінства паняццяў “жанчына” – “любоў” – “душа” парушана. Жанчына са спустошанай душой, без любові – “дзіўная”, “страшная”, “незразумелая”. Менавіта так Даніла ўспрымае Ганну. Яна паказана па-за домам, па-за сям’ёй – не ў сваёй традыцыйнай сферы, і займае чужую – мужчынскую – нішу ў сацыяльнай структуры.

Вобраз Ганны Матузовай, як большасць жаночых у Зарэцкага, трагічны. Жанчына стаіць на шляху да адзіноты, бо не мае душэўнай прывязанасці, яе барацьба за вольны свет перарасла ў барацьбу з сабой. У перспектыве лёс Ганны бачыцца такім, як у Марыны Гарновай, галоўнай гераіні апавядання “Кветка пажоўклая”, бо адплата за памылкі коштам у чалавечае жыццё рана ці позна абавязкова наступае.

Неаднойчы “дзіўнай” аўтар называе Шумаву – галоўную гераіню апавядання “Дзіўная”. Яна, прадстаўніца жанаддзела, прыязджае ў распараджэнне Блонскага для правядзення асветнай работы сярод жанок. Яе задача – агітацыя жанчын за новы быт, а іменна, за даручэнне выхавання дзяцей дзяржаве, каб самім быў час уключыцца ў стваральную працу. Шумава дзейнічае адпаведна сваім заклікам – аддае сына ў дзіцячы дом. Паміж ёю і Блонскім узнікае ўзаемнае пачуццё, але жанчына баіцца праяўлення ў сабе чыста жаночых рыс і пакідае яго. У яе каханні змагаюцца то страсныя, то рацыянальныя моманты. Яе жаночая душа яшчэ не зазнала такога перараджэння, як у Ганны Матузовай, і яно адбываецца не праз адмаўленне сябе як жонкі або гаспадыні, а праз адмаўленне сябе як жанчыны і маці наогул. Невыпадкова ў гераіні няма імені – толькі прозвішча.

У выніку самаразбуральнай дзейнасці Шумава аказваецца, як яна кажа, “без лішніх прывязанасцей” – г. зн. пазбаўленай кахання Блонскага і любові ўласнага дзіцяці. Жыццё ў рабоце, у новых планах і задачах не здольна замяніць у ёй жанчыну на “маленькі шрубчык”, а самі планы і задачы выглядаюць злачыннымі. Прапагандысцкая дзейнасць Шумавай у жанаддзеле фактычна накіравана на стварэнне дзіцячых дамоў, адчужэнне дзяцей ад мацярок. І ў гэтай нястомнай працы паступова, як шкодная праява “старога”, у яе душы выпальваецца сама жаночая ідэнтычнасць.

У хвіліны разрыву з Блонскім яна прызнаецца: “Сама сябе баюся... Ува мне можа абудзіцца жанчына... Не наогул жанчына, а такая... ну, слабая, адданая, бязвольная... Жанчына-раба, такая, якой не павінна быць, якая – знявага для чалавека...” [4, с. 246]. Каханне чарговы раз названа зняважлівым, рабскім пачуццём для слабых. Чаму? Думаецца, пісьменнік штораз спрабуе дастасаваць паняцце любові да новых умоў жыцця і кожны раз, як бы апраўдваючыся перад рэвалюцыйнай мараллю, адступае, пакідаючы пытанне адкрытым.

У рэшце рэшт, празаік усё называе сваімі імёнамі ў форме рытарычных пытанняў – праз разважанні Блонскага аб Шумавай: “Што ж гэта, нарэшце? Фанатызм, вар’яцтва? А мо сапраўды так лепей? Мо гэта натуральна, мо так і павінна быць? Мо гэта адзіны правільны шлях?” [4, с. 250]. Ва ўмовах уціску рытарычнае пытанне – вельмі ўдалы сродак для выражэння аўтарскай думкі, які будзе выкарыстаны Міхасём Зарэцкім яшчэ не раз.

Галоўная гераіня – "дзіўная" жанчына, бяда якой у тым, што яна кідаецца на ўцёкі ад самой сябе, спрабуе згуляць на сваё будучае з жыццём у такую гульню, дзе правілаў не прадугледжана.

У 1929 г. скразныя вобразы "пажоўклай кветкі", "дзіўнай" жанчыны ўвасобіліся ў трагічным вобразе Марыны Гарновай з апавядання "Кветка пажоўклая", які ўвабраў і сканцэнтраваў многае з таго, што было напісана дагэтуль, і стаў крокам да таго, што яшчэ будзе створана.

Каханне і чалавечыя адносіны ў 20 - 30-я гг. нагадваюць ваенныя часы, бо кожнага гняце невядомасць, хто заўтра застанецца ў страі, а каго спасцігне смерць, хто будзе ўзнагароджаны, а хто пакараны. Абставіны рэпрэсій вымушаюць галоўную гераіню Марыну Гарнову рабіць антычалавечыя ўчынкі, якія здаюцца правільнымі, пакуль не тычацца кагосьці з блізкіх людзей – тых, з кім чалавек звязаны любоўю. Чэкістка Марына падпісвае ў ліку іншых смяротны прыгавор роднаму брату, баючыся быць абвінавачанай у патуранні сваякам – класавым ворагам. Яна, як Ніна Купрыянава, калі выдае Зарубу, як Шумава, калі пакідае дзіця, дзейнічае адпаведна патрабаванням часу, але – насупроць сваёй волі.

Вырадлівая, узрошчаная фанатычнымі перакананнямі чалавечая воля – падстава для шматлікіх духоўных трагедый, глеба, на якой узрастаюць найгоршыя ўчынкі і жоўкнуць найлепшыя кветкі чалавечых памкненняў. Вакол шыі гераіні заціскаецца вязьмо ўласных памылак. Яна прынесла ахвяру – і сама стала ахвярай. Гэта эстафета ахвяраванняў эфемернаму ідэалу штораз абурае аўтара, яна ж прыводзіць да усвядомленага самазабойства інтэлігентку Гарнову. Вобраз Марыны вызначальны тым, што праз яе смерць становіцца зразумелым кошт той светлай будучыні, у якую яе заклікалі верыць.

Зноў гучыць матыў любові. Няхай яна называецца тут "слабасцю", "ліпучымі путамі", "атрутным павучыннем", "хмелем", "прыгожаю, але грузкай, дрыгвянай багнай", але яна – прычына, якая вымагае ад Марыны Гарновай ачышчэння, якая вяртае жанчыну ў страчаную сістэму каардынат.

Міхась Зарэцкі, плоцячы даніну часу, быццам бы выкіроўвае ў фінале "Кветкі пажоўклай" на "правільны" шлях, проста, здаецца, адваротны зместу твора: "Кветка пажоўклая (падкрэслена намі. – *І. В.*). І таму адляцела, адпала ад дрэва жыцця, зволіла месца здароваму, свежаму. І нямала было такіх кветак, што прыцягнуліся к сонцу Кастрычніка, што закрасавалі ў ім цветам жывым, пышна-дзейным. Але глыбока ўраслі ў атрутна-гнілую глебу, набраклую лёкам смяртэльным. І не вытрымалі палкага сонца. Пажоўклі..." [4, с. 356]. Тым не менш, думаецца, у гэтых некалькіх словах маецца падтэкст.

Звернемся да слоў "ураслі ў атрутна-гнілую глебу (падкрэслена намі. – *І. В.*), набраклую лёкам смяртэльным". Яны пераклікаюцца з фінальнай фразай апавядання "На маладое": Марылька "панікла без пары, як кветка ў дрэнным, атрутным паветры (падкрэслена намі. – *І. В.*)". У фінальнай казцы-прытчы пра злога лесуна і бярозку ў аповесці "Голы звер" мы зноў сустрэнем матыў гнілога балота. Лідачка, адна з гераінь аповесці, паддалася салодкай атруце лёгкага жыцця, якую ўвасабляе Яроцкі. Пісьменнік параўноўвае яе з кветкай, з якой "пасыпаліся і лісточкі, бо пажоўклі яны, бо атруціліся лёкам

балотным (падкрэслена намі. – *І. В.* ). Яна не памёрла. Яна жыла яшчэ, дажывала. Толькі вецце яе... засвіцілася пруццем счарнелым, бо ападалі ўсё... слязьмі на брудны дол апошнія яе лісточкі.” [5, с. 55]. Калі прывесці гэтыя словы ў адпаведнасць са зместам згаданых твораў, то можна заўважыць агульнае: смяртэльны атрутны лёк – гэта “дзікія, ачмураючыя душу і сэрца забабоны” [4, с. 74], з якой бы эпохі яны ні выраслі.

Можна сказаць, што вобраз Марыны Гарновай – праграмны. Ён – апазіцыя беспрынцыпнасці, ідалапаклонству, бездухоўнасці паказанага Зарэцкім грамадства. Ён – рамантычны і трагічны па гучанні: адзінокая, падманутая ў марах і спадзяваннях, гераіня гіне ў змаганні за сваю чалавечую вартасць. У характары Марыны ўвасобілася мінулае, “былое”, тая каштоўнасная аснова, носьбітам якой традыцыйна з’яўлялася жанчына.

***Раманныя вобразы жанчын у творчасці Міхася Зарэцкага.*** Адным з дасягненняў пісьменніка заслужана лічыцца раман **“Сцежкі-дарожкі”**. Напісаны непасрэдным удзельнікам падзей, твор поўніцца духам пераломнага этапу ў гісторыі нашай краіны. Бясспрэчная каштоўнасць гэтага рэдкага твора ў тым, што “Зарэцкі-мастак быў яшчэ свабодны ад згубных дагматычных прадпісанняў” (М. Мішчанчук) [1, с. 56], якія дзейнічалі ў 30 – 50-я гг. У рамане адсутнічаюць пазнейшыя наменклатурныя клішэ ў абмалёўцы рэвалюцыянераў і ворагаў, тыповых сялян і бальшавікоў, якія зрэдку праглядваюць у “Вязьме”.

У межах рамана “Сцежкі-дарожкі” як бы паядноўваюцца разнапланавыя вобразы і лініі кахання з апавяданняў. Вакол галоўнага героя Васіля Лясніцкага разгортваецца сюжэт, будова якога, паводле М. Мішчанчука, “вяршынная” (буйным планам паказваюцца толькі вызначальныя падзеі) [1, с. 56], прычым “вяршыні” ў творы звязаны з каханнем галоўнага героя.

Пошукі правільнай дарогі вядуць Лясніцкага да яго юнацкага кахання – дачкі пана Янава. У вобраз Раісы ўпляліся сюжэтныя знаходкі аўтара з апавядання “Ворагі” (каханне Ніны да ворага Зарубы і Раісы – да бандыта Карла Шэмпеля), а таксама матыў кахання і смерці з апавядання ”Кветка пажоўклая” (самазабойства Марыны і Раісы).

Вобраз “пажоўклай кветкі” – Раісы, хутчэй за ўсё, вабіў Лясніцкага трагізмам і некаторай экзальтаванасцю, хаця нельга, безумоўна, скідаць з рахунку і іншыя прычыны, пра якія згадвае М. Мушынскі. “Сялянскі сын, - піша крытык, – цягнецца да панскай дачкі, бо не бачыць у ёй прыніжанасці, пасіўнай пакоры, уласцівых характару вясковых дзяўчат і маладзіц. Яго вабіць адукаванасць паненкі, шырыня яе інтарэсаў” [7, с. 87].

Раіса Янава павольна памірае, хворая на душу і цела, не толькі праз свайго каханка – дзядзьку Карла, а і праз няздольнасць прыстасавацца да змененых умоў. Вось як слушна тлумачыць сутнасць абставін, у якіх прыйшлося змагацца з новым светам гераіням Міхася Зарэцкага, А. Гібок-Гібкоўскі: “Каб ацалець фізічна, “ворагам” неабходна было прыстасавацца – гэта давала шанц. Але і Ніна Купрыянава, і Раіса Янава наўрад ці маглі такі шанц выкарыстаць. Пры любых абставінах яны застаюцца самімі сабой. Іх лёс трагічны, прадвызначаны. ...іх вобразы... застаюцца ў сэрцы чытача як ідэал высокай прыгажосці, духоўнай цэльнасці, нягледзячы нават на спробы аўтара ў канцоўках твораў неяк знізіць іх узровень” [2, с. 24].

Яркі рамантычны вобраз Раісы працягвае парадыгму трагічных вобразаў “пажоўклых кветак”, у якой знаходзяцца “былыя” – Ніна Купрыянава, Мар’я, Марылька і інш.

Галоўны герой рамана “Сцежкі-дарожкі” Васіль Лясніцкі працягвае дослед сучаснасці праз зносіны з удавой Макрынай, якая ўвасабляе для яго “ў дыме сіняе смагі, невыразна-знаёмае, любае” – “кажуховую вёску”, “народ” [4, с. 90].

Жывы, каларытны вобраз салдаткі абяцае напачатку стаць вядучым, ён падрабязна распрацаваны. Каханне Лясніцкага з вясковай прыгажуняй апаэтызавана пісьменнікам, узведзена ў ранг высокага эстэтычнага пачуцця. І, магчыма, пры іншым сцэнарыі яе моцная, глыбока пачуццёвая натура дала б пра сябе знаць з большай акрэсленасцю, але бліжэй да фіналу яна як бы застывае ў сваім развіцці, падуладная сацыяльнаму заказу. Васіль не знаходзіць шчасця з Макрынай: ягонае месца займае дзейсны селянін Рыгор, а потым – бальшавік Андрэй. З цёмнай сялянкі ўдава пераўтвараецца ў работніцу мануфактуры, паплечніцу Андрэя па барацьбе – у “новую”, або, па словах Дз. Бугаёва, “правільную” гераіню.

Яшчэ адна “новая” жанчына ў творы – Ніна. Вакол яе вобраза таксама завязваюцца ніці кахання: Ніна – Халіма, Ніна – Славін, Ніна – Лясніцкі. Паказваючы, што Халімава дарога аблудная, Міхась Зарэцкі не пакідае дзяўчыну з гэтым анархістам, удзельнікам пагромаў, а потым бандытам і беляком. Нават дзіця, народжанае ад яго, гіне, ахвяраванае на справу рэвалюцыі (Ніна едзе вязваляць Лясніцкага і яго сяброў і пакідае хворае дзіця без нагляду).

Пошукі шчасця Нінай са Славіным, яе намаганні палюбіць філосафа-летуценніка таксама не даюць плёну. І гэта зразумела – “былы” Славін аднаго поля з Абшарскім, “воздыхателем” Марыны Гарновай (“Кветка пажоўклая”), Сяргеем, платанічна закаханым у жонку сябра (Ой, ляцелі гусі...”), Плаксам – “першым сівецкім рыцарам” Веры Засуліч (“Вязьмо”). Усе яны – нерашучыя сузіральнікі жыцця, сімпатычныя сваёй сціпласцю і самаахвярнасцю рыцары філасофіі, праўда, часта сафістычнай і бяздзейснай, і самаахвярнага кахання. Кожны з іх маўкліва назірае за аб’ектам свайго пачуцця, пакутліва чакаючы, пакуль звольніцца месца побач. Ніна расстаецца са Славіным, так і не здолеўшы адказаць на ягонае каханне, не знайшоўшы ў ім духоўнага апірышча.

У прынцыпе, Ніне (у адрозненне ад Макрыны, вобраз якой з’яўляецца “пагранічным” паміж “былымі” і “новымі”) адмоўлена ў глыбокім каханні. Тое, што Лясніцкі збіраецца іх “дружбе і блізкасці надаць больш пэўныя і сталыя формы”, бо “наперадзе дужа многа барацьбы і працы” [5, с. 388], не вынікае канкрэтна з узаемаадносін герояў. Гэта хутчэй даніна агульнай канцэпцыі твора: пошукі, з кім быць – гэта пошукі сваёй “сцежкі-дарожкі” ў жыцці. Дарогі Ніны і Васіля Лясніцкага – з бальшавікамі, у новае жыццё, і таму яны сыходзяцца. Дарога Васіля і Раісы – ганебнае вяртанне ў мінулае. Дарога Васіля і Макрыны – чыста пачуццёвая, а значыць, бескарысная.

Такім чынам, Ніна з ціхага міласэрнага стварэння трансфармуецца ў вобраз сацыяльна заангажаваны і ў многім безжыццёвы.

Асаблівай завостранасці праблемы жыцця і смерці, кахання і шчасця дасягнулі ў маральна-філасофскім творы “Ой, ляцелі

гусі...", дзе у вобразе Тацяны закладзены пачаткі галоўнага жаночага вобраза пазнейшага па напісанні рамана "Вязьмо".

М. Мушынскі, аналізуючы апавяданне, адзначае выразны "ўплыў рамантычных традыцый" [4, с. 514]. Заблытаўшыся ў сваіх перакананнях, галоўны герой Адам Барковіч бачыць у сваёй жонцы Стасі, у каханай Тацяне, у сябру Сяргею зброю "тых варожых сіл, з якімі ямі яму (як рамантычнаму герою – *І. В.*) прыходзіцца весці змаганне" [4, с. 433].

Вобраз настаўніцы Тацяны адразу звяртае на сябе ўвагу. Дагэтуль нідзе ў Міхася Зарэцкага так ярка не праяўляўся характар жанчыны-"драпежніцы". Калі Адам адмаўляецца ад смяртэльна хворай жонкі і пакідае яе ў горадзе пад наглядам Сяргея, то ў пошуках шчасця збягае на Палессе, да Тацяны. Але яе недухоўнае каханне не дае Барковічу заспакаення. Спакваля ён са здзіўленнем і захаваным задавальненнем ("не я адзін такі") пачынае заўважаць, з якой жанчынай звёў яго лёс і якую "халодную злосць", "палкую радасць" Тацяна адчувае з прычыны магчымай смерці саперніцы. "Нікуды не едзь... Я не пушчу... – кажа яна Адаму, калі той едзе апошні раз пабачыцца з жонкай. – Ты будзеш са мной... Хай сабе, хай памірае..." [4, с. 431]. Нешта падобнае можна ўбачыць у вобразе Веры Засуліч з рамана "Вязьмо".

Сымон Карызна і Вера Засуліч (раман "**Вязьмо**") таксама, як Барковіч і Тацяна ("Ой, ляцелі гусі..."), імкнуцца застацца "чысценькімі", незаплямленымі сардэчнымі перажываннямі. Сымон, як Барковіч у Тацяне, шукае збавення ад душэўных пакут у абдымках Веры Засуліч. Новыя старонкі рамана адкрываюць новыя рысы падабенства Тацяны і Веры. Напрыклад, у эпізодзе, калі законная жонка Карызны павінна вось-вось сысці з дарогі, "Вера Засуліч... не ўправілася схаваць свае раптоўнае радасці, і гэта ўвяло яе ў палкі сорам" [6, с. 138]. Як Тацяна і Барковіч баяцца і напружана чакаюць смерці Стасі, так Вера і Карызна чакаюць, калі пойдзе ад яго Марына Паўлаўна.

Вобраз Веры Засуліч, на першы погляд, з'яўляецца працягам галерэі "новых" жаночых персанажаў, але ў ім ёсць прынцыповае адрозненне ад усіх астатніх – хоць ён і рамантычны, але не трагічны. Шаблонны па форме, ён аблегчаны па змесце. Тут спалучаны і рысы "драпежніцы" Тацяны, і "новай" жанчыны Ніны, але яны толькі знешнія. Узнікае адчуванне, што ідэалагічная ўстаноўка на абмалёўку савецкай актывісткі даведзена пісьменнікам да абсурду, а канцэпцыя вобраза свядома спрошчана, часам нават карыкатурызавана.

Вельмі натуральная для атмасферы 20 – 30-х гг., "непасрэдная і наіўная" рэакцыя Веры на розныя падзеі з пункту гледжання гуманістычных каштоўнасцей не вытрымлівае крытыкі. Стаўленне да яе ў аўтара скрозь іранічнае. Звернемся да тэксту і паназіраем, як называе пісьменнік Веру, якія эпітэты і дэталі ўжывае для яе характарыстыкі.

Калі Карызна расказвае Веры пра сваіх раскулачаных бацькоў, тая вельмі палохаецца, бо "яна, <u>небарака</u> (падкрэслена намі – *І. В.*), не ўяўляла сабе нічога страшнейшага за сацыяльнае паходжанне" [6, с. 102]. Сымон, на дзіва для Веры, нават не здольны ненавідзець бацькоў-кулакоў. "Бацькоў заўсёды шкода бывае..." – падзялілася вопытам дзяўчына "і <u>дзелавіта</u> ўздыхнула" [6, с. 104]. Карызна, знаходзячыся ў падаўленым стане, купляецца на "яе шчырыя, прасякнутыя слушным практыцызмам парады": "Трэба

старацца, трэба дужа старацца... каб усё было добра, усё чысценька, каб ніхто ні да чога не мог прычапіцца...” [6, с. 139].

Пасля Карызнавага выключэння з партыі ягоная сяброўка дзейнічае па вельмі зручным прынцыпе – адмаўляцца ад памылак мінулага, як толькі стане яўнай неадпаведнасць “генеральнай лініі”. “Нашто ты зрабіў так... не так, як трэба...” – наіўна здзіўляецца дзяўчына. І аўтар зазначае: “Яна – гэтая мілая, шчырая дзяўчына – у сваёй бязмежнай непасрэднасці забылася ўжо, што і сама старанна памагала яму рабіць “не так, як трэба” [6, с. 275]. Потым Вера мяняе небяспечнага Карызну на бяспечнага старшыню свежазлепленага калгаса Андрэя Шыбянкова.

“Вера Засуліч была разумная дзяўчына. Разам з сваёй мілай дзяцінай наіўнасцю яна мела вострую, мабыць, цалкам інтуіцыйную праніклівасць, злучаную з дасканалай здольнасцю дапасавацца да ўсякіх, нават самых нечаканых варункаў... “ [6, с. 140]. Скажам, непрыстойнасці Пацяроба “яна пакорна зносіла... з павагі да мясцовае ўлады” [6, с. 140].

Яскрава характарызуюць Веру дачыненні з Гвардыянíхай: “У глыбіні душы Вера, безумоўна, толькі смяялася з Матруны Іванаўны, але разам з тым адчувала да яе найшчырэйшую сімпатыю і да апошняй пары не кідала вадзіць з ёю сяброўства, карыстаючы сяды-тады з яе добраахвотных паслуг”. Яе пачуцці да смешнай жанчыны – “зацятага ворага партыі і Савецкай улады” дзівяць ненатуральнасцю, якая вынікае з панічнага страху неспадзявана стаць “апартуністкай, абываталькай, кулацкай падпявалай, здрадніцай” [6, с. 48]. І Вера, змагаючыся з уласнымі страхамі, на сходзе ячэйкі “ў гарачыя запальныя словы ўкладае сваё глыбокае абурэнне супроць тых, хто ставіць палкі ў кола вялікага будаўніцтва... і патрабуе найлюцейшае барацьбы з імі...” [6, с. 47] – а значыць, і з маленькай молепадобнай жанчынай. Узяўшы ад “кулацкай гідры” Матруны Іванаўны сала, Вера “трапечацца ўсім целам, як у прыпадку, і істэрычна плача” [6, с. 49] Гэтая сцэна, магчыма, выклікала б спачуванне, калі б далей аўтар не іранізаваў над яе няшчырасцю і самападманам: “Вера Засуліч нялюдскай патугаю волі сунімае свой плач: няма часу, трэба ісці на “кройку-шыццё”. Прыйдзецца хіба паплакаць потым ужо, кладучыся спаць” [6, с. 49].

Абурэнне ўчынкамі Веры Засуліч выражаецца і ў момант, калі наіўная Карызнава дачка Стася пытаецца, ці любіць Вера яе бацьку. “І чыстая, бязвінная, як дзіця, Вера Засуліч з анёльскай шчырасцю ёй адказала: “Я не ведаю, Стася...”” [6, с. 285].

Напрыканцы твора, яшчэ раз ужываючы слова “чысценькі”, празаік канчаткова акрэслівае сутнасць вобраза Веры Засуліч – імкненне, не зважаючы на сродкі, застацца “чысценькім”, нават непапраўна запляміўшы сваё сумленне: “Лозунгі ўсе распісаны былі пад непасрэдным кіраўніцтвам настаўніцы пачатковае школы Веры Засуліч і вырзна адлюстроўвалі ў сабе індывідуальныя рысы гэтае энергійнае, спраўнае і чулае да грамадскага жыцця працаўніцы. Яны былі ўсе чысценькія, роўненькія, прыгожанькія і дакладна адпавядалі палітычным задачам сённяшняга дня” [6, с. 295].

Сапраўдныя, без іроніі, думкі пісьменніка пра гераіню ўсё ж сустракаюцца ў творы. І выражаны яны не ў аўтарскіх словах, а ўскосна, вуснамі Галілея – той часта называе яе “нядобрай”.

Іншыя, другарадныя жаночыя вобразы больш рэалістычныя, бо яны не такія небяспечныя для крытыкі. Паказальна, што гэтыя характары надзелены здольнасцю кахаць, а гэта якасць для Міхася Зарэцкага прынцыповая.

Лінія кахання Аўгінькі і камсамольца Віктара, як Васі Ганчарыка і Анюткі Ладымеравай (В. Быкаў "Знак бяды"), абрываецца на сцэне раскулачвання, высялення. Як Міхась Зарэцкі ў 20-я, так і В. Быкаў у 80-я звяртаюцца да праблемы крызісу ідэалаў – ідэалагічных і агульначалавечых. Вечная каштоўнасць кахання саступае месца часовым устаноўкам партыі, і адбываецца непапраўнае парушэнне гармоніі чалавечых адносін і злачынства супраць справядлівасці.

Ачмураны, у дадзеным выпадку камсамольскімі, "забабонамі" Віктар ніяк не можа пагадзіць дзве любові, якія рвуць яго на часткі – адданасць справе і моцную сімпатыю да Аўгінькі. Каб быць на грэбені падзей, камсамольцу неабходна выканаць загад партячэйкі аб раскулачванні Аўгіньчынага бацькі "на сто – ды не, на дзвесце працэнтаў" [6, с. 266]. Хлопец праз маладосць і чысціню пачуццяў яшчэ не можа адкаснуцца ад парыванняў свайго сэрца ў момант расстання, яго "падашукала адна нікчэмная дробязь, праз якую ён ледзь не страціў быў свае мужнасці" – "адзін куточак... любых вуснаў увесь час смешна рухаўся ўгару... і ў гэту хвіліну... апанаваў быў Віктара той дрэнны ліпучы жаль, якога ён баяўся. Толькі напяўшы ўсе свае сілы, ён стрымаўся, каб не кінуцца да яе і, плачучы..., не закрычаць" [6, с. 267]. Пакуты сумлення Віктара, каханне, чарговы раз называюцца "ліпучым жалем", "нікчэмнай дробяззю", што выразна кантрастуе з абставінамі, пры якіх яны прыменены. Зарэцкі падсвядома рэабілітуе сапраўднае пачуццё і ставіць Аўгіньку побач з іншымі трагічнымі вобразамі "пажоўклых кветак". Імкненне дзяўчыны чытаць камасамольскія кніжкі, быць, як усе, выглядае бездапаможнай спробай уліцца ў жыццё, не быць адрэзанай лустай.

Пісьменнік настойліва паўтарае з твора ў твор, што здольнасць кахаць, сімпатызаваць каму-небудзь – не пралетарская з'ява, і тым не менш настойліва выпрабоўвае сваіх герояў каханнем. Нават характарызуючы такога станоўчага героя, як Зелянюк, зазначае, што той "паказваецца ў гэтым апавяданні як цалкам станоўчы, мала не ідэальны герой сучаснасці, але і ён, як кожны жывы чалавек, меў свае <u>слабасці</u>" [6, с. 205]. Яго каханая – Стася – вышэй за ўсё ставіць шчырасць і сямейныя адносіны, лічачы, што чалавек, які фактычна спрыяў выключэнню яе бацькі з партыі, нават вельмі добры чалавек, парушыў тыя тонкія ніці, якія іх звязваюць. Стася застаецца адзін на адзін са сваімі нявырашанымі пытаннямі.

Такім чынам, у раманах Міхася Зарэцкага працягваецца распрацоўка заяўленых яшчэ ў малой прозе жаночых вобразаў.

Раманныя і апавядальныя жаночыя характары ўтвараюць сабой арганічнае адзінства. Творчасць пісьменніка – роздум пра жанчыну, яе сутнасць і месца ў грамадстве 20 – 30-х гг. Асноўныя праблемы, над якімі працуе аўтар – адзінота і безабароннасць жанчыны з яе тонкай ментальнасцю перад жорсткім светам, яе духоўная барацьба са злом, крызіс ідэалаў.

Рамантычны жаночы вобраз інтэрпрэтуецца пісьменнікам у некалькіх іпастасях:

1. Як трагічныя прадстаўлены характары жанчын дарэвалюцыйнага грамадства, выяўленыя з дапамогай сімвала “пажоўклай кветкі”. Галоўная іх рыса – няздольнасць адмовіцца ад сваіх ідэалаў, за што яны пазбаўлены месца ў новым жыцці.
2. Вобраз жанчыны, якая намагаецца нейкім чынам дастасаваць свае перакананні да “новай” маралі і сама становіцца яе ахвярай, намінаваны пісьменнікам як вобраз “дзіўнай” жанчыны.
3. Асобна стаяць вобразы “новых” жанчын, якія створаны адпаведна сацыяльнаму заказу і з гэтай прычны адрозніваюцца некаторым схематызмам. З іх вылучаецца іранічны вобраз савецкай актывісткі Веры Засуліч.

Наогул, творчасць Міхася Зарэцкага мае выключнае значэнне для развіцця жаночага характару ў беларускай прозе. Пісьменнік увёў жанчыну з яе інтымнымі, духоўнымі перажываннямі ў кантэкст вялікай літаратуры. Сілаю свайго таленту мастак здолеў занатаваць для нашчадкаў працэсы грамадскай дэфармацыі вобраза традыцыйнай жанчыны у савецкую, які на дзесяцігоддзі зойме сваё месца ў нацыянальнай літаратуры. Пры гэтым аўтар выявіў гуманістычны падыход да раскрыцця жаночага вобраза на зломе эпох.


1. Беларуская літаратура ХХ ст.: Вучэб. дапаможнік / М. Мішчанчук, І. Шпакоўскі. – Мінск: Выш. школа, 2001. – 352с.
2. Гібок-Гібкоўскі А. “Гарэла святая нянавісць...”: Тэма грамадзянскай вайны ў творчасці Міхася Зарэцкага // Роднае слова. – 1997. – № 2. – С. 22 – 36. Зарэцкі М. Збор твораў: У 4 т. Т. 1: Апавяданні. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 526 с.
3. Гісторыя беларускай савецкай літаратуры / Пад рэд І. Навуменкі і інш.: У 2 ч. Ч 1. – Мн.: Выш. школа, 1981. – 382 с.
4. Зарэцкі М. Збор твораў: У 4 т. Т. 1: Апавяданні. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 526 с.
5. Зарэцкі М. Збор твораў: У 4 т. Т. 2: Голы звер: Аповесць; Сцежкі-дарожкі: Раман. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 414 с.
6. Зарэцкі М. Збор твораў: У 4 т. Т. 3: Вязьмо: Раман; Сымон Карызна: Драм. аповесць. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 375 с.
7. Мушынскі М. Нескароны талент: Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 294 с.